# Новыя імёны і творы ў беларускай літаратуры

Матэрыялы для лекцыі

# Відавая разнастайнасць сучаснай беларускай прозы:

# Рэалістычная проза

- вызначаецца падрабязнымі і дакладнымі апісаннямі герояў з абавязковай псіхалагічнай матывіроўкай іх дзеянняў і ўчынкаў, абмалёўкай прадметнага свету, адлюстраваннем канкрэтнага і рэальнага месца дзеяння, апісаннем гістарычных і часавых рэалій, дакладным узнаўленнем асаблівасцей побыту, нораваў і мовы прадстаўнікоў таго альбо іншага сацыяльнага асяроддзя.

Адкрывае ў мастацкай эпічнай форме новыя праявы жыцця чалавечага грамадства.

**Ягор КОНЕЎ (1970 г.н.)** — пісьменнік, драматург, публіцыст.

З 1999 г. выкладае на факультэце журналістыкі БДУ. Дацэнт кафедры замежнай журналістыкі і літаратуры, кандыдат філалагічных навук.



**Аповесці:**

- **Рытуал // Маладосць. — 1998. — № 8-9.**
- **Смаргонскі настаўнік і вучань // Маладосць. — 2001. — № 6.**
- **Срэбны арол у чырвоным полі // Полымя. — 2003. — № 10.**
- **Амерыканская адысея Тадэвуша Касцюшкі // Полымя. — 2004. — № 10-11.**
- **Нямігі берагі // Маладосць. — 2004. — № 7.**
- **Глеб Менскі // Маладосць. — 2005. — № 7-8.**
- **Грэчкасейная ідылія Тадэвуша Касцюшкі // Полымя. — 2008. — № 1-2.**
- **Здані Гарадніцы // Маладосць. — 2009. — № 1-2.**
- **Літоўская адысея Тадэвуша Касцюшкі // Полымя. — 2009. — № 5-6.**
- **Новыя палескія рабінзоны // Маладосць. — 2011. — № 1.**

**П'есы**

- ✔ **Старажытны перыяд, або Гісторыя і каханне // Маладосць. — 2006.- № 9.**
- ✔ **Дамавічкі // Дарункі добрых духаў / П'есы для аматарскіх тэатраў / Уклад. Каржанеўская Г. А., Скрыпка І. П. — Мн., 2007.**
- ✔ **Гісторыя двух сабак // Маладосць. — 2007. — № 8.**
- ✔ **Калядная зорка // Маладосць. — 2010. — № 1.**

**Кнігі**

- Вартавыя. — Мн.: Бібліятэка часопіса «Маладосць», 1995;
- Тайна пропавшей коллекции. — Мн.: Современный литератор, 1999;
- **Амерыканская адысея Тадэвуша Касцюшкі. — Мн: Маст. літ., 2006.**



# Дакументальная літаратура

- гэта разнавіднсць прозы, заснаваная на рэальных фактах, дакументальных сведчаннях і аповядах відавочцаў, даследуе гістарычныя падзеі, апісвае факты, зводзячы да мінімума мастацкую выдумку. Аўтарскі пункт гледжання ў дакументальнай літаратуры выяўляецца ў адборы матэрыялу, яго сістэматызацыі і ацэнцы падзей.

**АДАМ ГЛОБУС (1958г.)** (сапраўднае імя Уладзімір Вячасла́вавіч Ада́мчык)

- беларускі пісьменьнік, мастак, выдавец, удзельнік таварыства “Тутэйшыя” (1986-1990)



***Выдадзеныя кнігі:***

- Парк (1988)
- Адзінота на стадыёне (1989)
- Сьмерць — мужчына (1992)
- Скрыжаваньне (1993)
- Дамавікамэрон (1994)
- Толькі не гавары маёй маме (1995)
- Койданава (1997)
- Новы дамавікамэрон (1998)
- *Post scriptum* (1999)
- Тэксты (2000), сабраны ўсе папярэднія кнігі.
- Браслаўская стыгмата (2001)
- Сшыткі (2003)
- **Дом (2005)**





**Ві́ктар Шалке́віч** (1959 г.) — беларускі, бард, актор, пісьменнік, шоўмэн.






"Рэквіем..." – гэта дваццаць апавядаў Віктара Шалкевіча. Як адзначае сам аўтар, "Гэтая сціплая кніга – адначасова і падзяка, і вечная памяць тым рэчам, малым і вялікім, сярод якіх мы гадаваліся, якія калісьці былі патрэбныя і ўсіх нас зрабілі такімі, якімі мы ёсьць цяпер, а ня іншымі".

**Проза**. – Гродна , 2011. – 100 с.

# МАСАВАЯ ЛІТАРАТУРА

- гэта літаратурная з’ява са сваёй спецыфічнай паэтыкай, папулярнымі жанрава-тэматычнымі канонамі, валодае стандартным наборам тэм і дзеючых асоб. Характарызуецца займальнасцю, аператыўнасцю ў выяўленні новых павеваў часу, чуллівасцю, пазнавальнымі канфліктамі.

**ЮРЫ СТАНКЕВІЧ (1949)** (сапраўднае імя — Георгі Васільевіч Харытановіч) -беларускі празаік, драматург. Увайшоў у літаратуру ў 1988 годзе.



***Выдадзеныя кнігі:***

- «Любіць ноч – права пацукоў» (1998),
- «Апладненьне ёлупа» (2005),
- «Мільярд удараў» (2008), «П'яўка» (2010).

*“Я знайшоў у гэтай кнізе нешта ад стылю Станіслава Лема. Гэта літаратура ўжо зусім не тая, якая была ў папярэдняй кнізе "Мільярд удараў", якая таксама выходзіла ў выдавецтве "Галіяфы". Гэты раман, як на мой погляд, ён на некалькі прыступкаў вышэй за папярэднія творы, гэта нешта іншае, нешта новае ў творчасці аўтара”.*

Зміцер Вішнёў,
рэдактар выдавецтва “Галіяфы”



**АРТУР КЛІНАЎ (1965)**

- беларускі канцэптуальны мастак, літаратар, фатограф, галоўны рэдактар часопіса «pARTisan». Жыве і працуе ў Мінску. **А**ўтар сцэнарыя да экранізацыі кнігі Яна Баршчэўскага «Шляхціц Завальня».



***Выдадзеныя кнігі:***

- «Горад СОНца. Візуальная паэма». Мінск: выдавецтва «Логвинов», 2005.
- «Sonnenstadt der Träume». Frankfurt: Suhrkamp Verlag, 2006.
- «Малая падарожная кніжка па Горадзе Сонца». Мінск: выдавецтва «Логвинов», 2008.
- «Przewodnik po Miescie Slonca». Wolowiec: wydawnictwo «Czarne», 2008.
- Альбом «Дванаццаць». Мінск: выдавецтва «Логвинов», 2009.
- Раман «Шалом. Ваенны раман». Мінск: выдавецтва «Логвинов», 2011.






# Эсэістыка і публіцыстыка

- характарызуецца спалучэннем падкрэслена індывідуальнай пазіцыі аўтара з нязмушаным выкладам інфармацыі і выяўляе аўтарскае “я” праз інтэлектуальна-эмацыянальную форму. Асноўныя жанры – эсэ і нарыс, у якіх аўтар ў адвольнай форме разважае над сацыяльна-палітычнымі, маральна-філасофскімі, літаратурна-эстэтычнымі праблемамі.

**ВАЛЯНЦІН АКУДОВІЧ (1950)**

- беларускі філосаф, паэт, літаратурны крытык.

***Выдадзеныя кнігі:***

«Мяне няма. Роздумы на руінах чалавека» (1998), «Разбурыць Парыж» (2004), «Дыялогі з Богам» (2006), «Код адсутнасці. Асновы беларускай ментальнасці» (2007).

Кніга «Дыялогі з Богам» перакладзеная на польскую мову (2008).

Асобныя тэксты друкаваліся ў ЗША, Польшчы, Расіі, Чэхіі, Македоніі, Сербіі, Украіне, Літве.



“У плане, так бы мовіць, прафесійным (тут я маю на ўвазе кампазіцыйнае майстэрства, форму, стыль) шведская літаратура не горшая і не лепшая за беларускую. Але сучасная беларуская літаратура, мне падаецца, больш канцэптуальная, больш энергетычная, больш, калі заўгодна, энергаёмістая. У ёй яшчэ шмат анталагічнай трывогі, яе нерв напружаны, а драматургія па-біблійнаму эсхаталагічная. Герой беларускай літаратуры яшчэ ведае, што такое неба, нават калі аўтар з уласнай сваволі запіхвае яго ў прыватную кунсткамеру”.



# Проза для моладзі і юнацтва

уключае мастацкія, навукова-мастацкія, навукова-папулярныя творы, разлічаныя на ўспрыманне дзецімі і падлеткамі, якія адпавядаюць духоўным і эстэтычным запытам асобы. Мае характэрныя адзнакі: дынамічны сюжэт, пазнавальныя канфлікты, выяўленне псіхалагічных праблем пэўнай узроставай катэгорыі моладзі, займальнасць, даступнасць.

**ВАЛЕРЫЙ ГАПЕЕЎ (1963)**

-беларускі празаік (творы для дзяцей і юнацтва), журналіст. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі

***Выдадзеныя кнігі:***

- "Пастка на рыцара" (2002);
- "Урокі першага кахання" (2010)



“Я абавязкова дам прачытаць гэту кнігу маім будучым дзецям. І зусім неістотна, што да таго часу гістарычны кантэкст стане неактуальным. Валерый Гапееў таленавіта і поўна раскрыў падлеткавыя праблемы, праз якія прайшлі мы, з якімі сутыкнуцца нашыя дзеці. Пісьменнік нязмушана, простай мовай, без дыдактычных нотак паказаў псіхалогію як дарослых, так і школьнікаў.”

Ася Паплаўская,
аглядальнік сучаснай прозы



# ПАЭТЫЧНЫЯ НАПРАМКІ

Эстэтычна-стылёвыя плыні :

- лірыка-апавядальная (Р.Баравікова, Л.Галубовіч і інш.)
- лірыка-публіцыстычная (Н.Гілевіч, С Законнікаў, М. Мятліцкі і інш.)
- філасофска-аналітычная (А.Вярцінскі, А.Сыс і інш.)
- мастацка-сінкрэтычная (Р.Барадулін, В.Зуёнак, І. Багдановіч і інш.)
- рамантычная (Я.Сіпакоў, В.Шніп і інш.)
- інтэлектуальная (А.Разанаў і інш.)

Характэрныя адзнакі сучаснай паэзіі:

- - празаізацыя паэтычнай мовы;
- - падтэкставасць думкі;
- - актывізацыя фарматворчых і жанраваўтваральных працэсаў.



Віктар Жыбуль (1978 г.н.). Закончыў філфак БДУ (2000), аспірантуру пры ім (2003). Кандыдат філалагічных навук (2003). Працаваў у часопісе творчай моладзі “Першацвет” (1995 – 2002), цяпер – у часопісах “Роднае слова” і “Arche”.

Набыў вядомасць як паэт-экспэрымэнтатар, аўтар некалькіх паліндромных паэм. Выдаў зборнікі паэзіі “Калі ў хаце дывэрсант” (1996), “Рогі гор” (1997), “Прыкры крык” (2001), “Дыяфрагма” (2003), “ Стапеліі ” (2012).

Вершы Віктара Жыбуля перакладаліся на англійскую, балгарскую, латышскую, літоўскую, нямецкую, польскую, украінскую, чэшскую мовы.

**ПАЛІНДРОМАН**
**ПРА РАКУ НЁМАН**

О, Нёман! Сага снам ён!
Нёмана мутны смак,
А сам —
У крамяны рышток рамонкавы ліся,
І нам дары, тытан,
І лад, і лёс, і арку марам,
Хаду цуда-хмарам
У краі сёл і далін.
А ты… ты рад:
Манія сілы, вакно маркот, шырыня мар!
Кум асакам,
Сын туманам ён, Нёман, —
Сага снам ён.
О!




**Творы Жыбуля належаць да той элітнай жывой літаратуры, якую падлеткі будуць чытаць (і нават перапісваць) без ніякага прымусу: на карысць гэтага сведчыць шчырае захапленне, з якім нават двоечнікі слухаюць дэкламацыі Віктара ў дзіцячых бібліятэках і школах.**

**Альгерд Бахарэвіч**

**Вершы.** – Мінск : Галіяфы, 2012. – 220 с.

**УСЕВАЛАД СЦЕБУРАКА (1981)**

— паэт. У 2007 г. выйшла кніга вершаў і прозы Усевалада Сцебуракі — “Крушня”.



*у пяць гадзін раніцы, у пяць.*

***У пяць гадзін раніцы, у пяць***
***шклом алкашы не звіняць,***
***дзеці макдональдсы сняць***
***у пяць гадзін раніцы, у пяць.***

***Хтосьці на працу ідзе,***
***хтосьці ідзе ваяваць,***
***хтосьці плыве па вадзе,***
***хтосьці працягвае спаць…***

***У пяць гадзін раніцы, у пяць***
***сонна ліхтарні гараць,***
***рана судзіць і караць***
***у пяць гадзін раніцы, у пяць.***

***У пяць гадзін раніцы, у пяць***
***можна сабе дазваляць***
***простыя рыфмы ствараць***
***у пяць гадзін раніцы, у пяць.***

***Хтосьці на працу ідзе,***

**АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ (1973)**

- беларускі паэт, перакладчык, бард. Выкладае замежную літаратуру на філалагічным ф-це ў БДУ. Перакладае на беларускую мову з англійскай, польскай, рускай, украінскай, французскай моў.



Піянер Усяслаў з Гарадзеі
кажа маці: «Пайду ў чарадзеі!
Усяго акрамя,
мілагучнае ймя
даць гарэліцы маю надзею!»;

Сэнбэрнар у папа з Маларыты
меў вялізарныя габарыты,
бачыў смачныя сны
пра кавалак мясны
й памятаў, дзе калега зарыты.

**Пры адавочнай інтэлектуальнасці творчасці паэта, якую адзначаюць большасць даследчыкаў, яго вершы валодаюць надзвычай прыцягальнымі для сучаснага чытача якасцямі – займальнасцю, знешней прастатой, гульнёвасцю.**




***Выдадзеныя кнігі:***

- «Листи з-під ковдри» (Київ: Факт, 2002)
- «Старыя вершы» (Менск: Логвінаў, 20)
- «Лісты з-пад коўдры» (Менск: Логвінаў, 2004)
- «Землякі, альбо Беларускія лімэрыкі» (Менск: Логвінаў, 2005)
- «From Belarus with Love» (Київ: Факт, 2005)
- «Сто лі100ў на tut.by» (Менск: Выдавецтва «Наша Ніва», 2006)
- «Swieta nowego rocku» (Уроцлаў: Kolegium Europy Wschodniej, 2006)
- «Бэрлібры» (Менск: Логвінаў, 2008)
- «Несымэтрычныя сны» (Менск: Логвінаў, 2010)

Як ты глядзеў тэлевізар тайком ад бабулі:
над галавою імгненьні сьвісьцяць, нібы кулі,
ледзь нашы гол у адказ забіваюць шатляндцам –
бабця ў адказ прабівае па задніцы сланцам.

Як ты з набітых кашоў выкідаеш лісічкі:
месца няма ўжо, а белых грыбоў усё болей.
Як літаральна за тыдзень мяняюцца звычкі
і геніяльна смакуе партвэйн дзядзі Колі.

Як па дарозе дамоў спатыкаўся, бы Чаплін.
Як, пачатковец-нудыст, ледзь ня зьмерз у Сажы
і, каб сагрэцца, – ударыла ў голаў мача, блін! –
сена калгаснага стог падпаліў. Раскажы!

Як ты глядзеў у кіно “Чалавека-амфібію”,
рот адкрываючы прагна спайманаю рыбаю.
Ўражаны бацька назаўтра купіў табе ласты.
Славік зайздросьціў: “Тапелец, а не вадалаз ты!”

Як з Засажэўскага лесу дамоў на папутцы –
першы твой раз, як сказаў бы цяпер, аўтаспынам.
Як ад дажджу ў тэлефоннай хаваліся будцы
з той, што пасьля назаве цябе сучыным сынам.

Дзе гэта ўсё? Аўтастанцыя. Ціша. Бязьлюдна.
Цераз пітомнік (бабуля казала “пітоўнік”)
крочыш паволі. Зьмянілася ўсё абсалютна

# ДРАМАТУРГІЯ

**Характэрныя адзнакі:**

- **Страта сваёй запатрабаванасці некаторых тэматычных напрамкаў (ваенная тэма, героіка-рэвалюцыйная тэма, сямейна-бытавая драма);**
- **Сінтэзацыя жанравых форм (драма+дакумент, пантаміма, мюзікл, п’еса-фантасмагорыя, п’есы-перфомансы;**
- **З’яўленне п’ес у традыцыях тэатра абсурду;**
- **Зварот да тэхналогіі стварэння п’ес шляхам адаптацыі, пераробак паводле прызнаных літаратурных твораў (п’еса-рэмейк): п’есы-прыпавесці, п’есы-містыфікацыі.**

Напрамкі развіцця сучаснай драматургіі:

- шлях адкрытага эксперыменту, выпрабаванне новых форм умоўнасці, нетрадыцыйнае выкарыстанне сцэнічнай прасторы і часу;
- выкарыстанне і трансфармацыя традыцыйных сродкаў, назапашаных айчыннай драматургіяй.



**АНДРЭЙ КУРЭЙЧЫК** (1980 г.н.) – беларускі і расійскі сцэнарыст, актор, драматург

На беларускай мове:

- Гістарычная драма “П’емонцкі звер”
- “Згублены рай” (“Полымя”, №1-2002)

Аўтар 22 п`есаў, але толькі малая іх частка апублікаваная ў часопісах «Архэ», «Полымя», «Нёман», «Першацвет». Андрэй выдаў 2 кнігі сваіх п`есаў, але іх набыць практычна немагчыма, таму што наклад раскуплены.

У 2007–2011 гг. у тэатрах Расіі, Беларусі, Украіны ды іншых краін паставілі больш за 30 яго п’ес.

**ДЗІЯНА БАЛЫКА (1980 г.н.)**

- Паэт, драматург, празаік, сцэнарыст, псіхолаг.

П’есы:

- “Белы анёл з чорнымі крыламі”
- “Псіхааналітык для псіхааналітыка”
- “Пупавіна”
- “Раман + Юлія: вечная гісторыя”
- “Мой уласны помнік”
- “Вяселля не будзе”





Пра змест п’есы «Белы анёл з чорнымі крыламі» –

Хочацца не сварыцца з роднымі, памірыцца з каханым, знайсці сябе іператварыць сваё жыццё ў цікава-захапляльную ў казку.

Так думае маладая Ніна, але ні родныя, ні каханы яе не разумеюць. Не разумеюць, што на жыццё пачынаеш глядзець іншымі вачыма, як пачнуць сніцца чорныя крылы белага анёла. Не разумеюць, што хочацца паспець пачаць усё спачатку, калі хвароба незаўважна бярэ цябе загрудкі. Не разумеюць, што кожны мае права на апошні шанец.